

АДКУЛЬ БЕЛАРУСКАЯ БУЛЬБА ФРЫ? **3**




ЭКСКУРС У МІНУЛАЕ СУБОТНІКА **8**

20 КРАСАВІКА 2024 г. СУБОТА

№ 79 (30213)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

На кантролі

# «Ва ўстаноўленыя тэрміны ўсе работы будуць выкананы»

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытаннях рамонтна-рэстаўрацыйных работ у Жыровіцкім манастыры

**Найперш спікер азнаёмілася з ходам рамонтна-рэстаўрацыйных работ на аб'ектах манастыра, наведала храм на яго тэрыторыі. Старшыню Савета Рэспублікі суправаджалі Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, намеснік Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі Гурый, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар Луцкі, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік, міністр культуры Анатоль Маркевіч, іншыя зацікаўленыя.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ПАДЗЯЧНАЕ ПІСЬМО



Учора ў сталіцы прайшла гарадская канферэнцыя «На фронце і ў тыле: жанчыны Вялікай Айчыннай вайны». У ёй узялі ўдзел больш за 600 чалавек — прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын з розных прадпрыемстваў і арганізацый Мінска, а таксама дэлегацыі з расійскіх рэгіёнаў. У рамках работы адной з секцый прадстаўніцы Ленінскай раённай арганізацыі БСЖ наведалі РУП «Белпошта» і Галоўпаштамт, дзе ім прапанавалі падпісаць і даслаць паштоўкі ветэранам. Дырэктар пачатковай школы № 29 Аксана АРЛОВА і начальнік аддзела інфармацыйных тэхналогій Мінскага халадакамбіната № 2 Таццяна КОШКІНА прызнаюцца, што пісалі цёплыя словы ўдзячнасці ад душы і спадзяюцца, што іх допісы парадуюць адрасатаў.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КУБРАКОЎ, міністр унутраных спраў:**

*«Мы дэталёва прааналізавалі трагедыю ў Падмаскоўі, улічылі магчымыя нюансы і выпрацавалі дадатковыя меры бяспекі ў месцах масавага знаходжання грамадзян, у тым ліку ў гандлёвых цэнтрах. Пастараліся зрабіць так, каб не ствараць нязручнасцяў для людзей, не абмяжоўваць іх перамяшчэнне, але пры гэтым поўнасцю кантраляваць сітуацыю. У маі плануем правесці маштабныя вучэнні з прыцягненнем усіх тэрытарыяльных органаў унутраных спраў рэспублікі і паказаць, як дзейнічаць у тых ці іншых абставінах. Жыхарам і гасцям краіны хачу сказаць, каб не перажывалі. Органы ўнутраных спраў робяць усё неабходнае, прымаюць вычарпальныя меры для забеспячэння бяспекі».*

Блізкая ўлада

# «Патэнцыял раёна значна вышэйшы»



Фота БелТА.

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЕНКА прыняў удзел у пасяджэнні Браслаўскага райвыканкама

**На пасяджэнні былі разгледжаны пытанні аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця Браслаўскага раёна за 2023 год, першы квартал бягучага года і задачах на 2024 год.**

Кажучы аб руху Браслаўшчыны за мінулы год, спікер ніжняй палаты парламента апісаў яго так: крок наперад — крок назад. «Па адных напрамках вы прасунуліся, па іншых аселі, — патлумачыў ён. — Але хацеў бы заўважыць, што першыя тры месяцы ўсяляюць упэўненасць у паступальным развіцці ў гэтым годзе».

СТАР. 2

Культурная прастора

# НЕ ВЫЯВІЦЬ НІ СЕКУНДЫ АБЫЯКАВАСЦІ

## Размова з генеральным дырэктарам Вялікага тэатра Беларусі Кацярынай ДУЛАВАЙ

**«Вялікі тэатр» — не проста назва. Гэта брэнд краіны, сімвал галоўных дасягненняў нацыянальнай культуры. Нават проста трапіць на работу ў Вялікі — ужо прызнанне... Па азначэнні, на гэтую сцэну павінны выходзіць найлепшыя з найлепшых. Тут некалі адбыліся прэм'еры першых нацыянальных беларускіх балета і оперы. І сёння кожная прэм'ера становіцца падзеяй, па-сапраўднаму рэзананснай, ды яшчэ трэба паспець купіць білеты — аншлагі ў тэатры сталі звыклымі.**

**Вось ужо трэці год узначальвае Вялікі тэатр Беларусі генеральны дырэктар Кацярына Дулава, якую да гэтага ведалі як рэктара Акадэміі музыкі. Кацярына Мікалаеўна знайшла магчымасць пагаварыць для нашых чытачоў аб тэатры, новых праектах, высокім мастацтве і тых, хто гэтаму мастацтву служыць.**



***— Як Вялікі тэатр плануе ўдзельнічаць у рэалізацыі Канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024—2026 гады?***

— Па сутнасці, мы ўжо ўдзельнічаем у гэтым працэсе, які шматгранны і разнастайны. У першую чаргу, мы гаворым аб пашырэнні нацыянальнага рэпертуару, аб пашырэнні відаў дзейнасці, накіраваных на патрыятычнае выхаванне нашых грамадзян. Гэта і ўзмацненне змястоўнага кантэксту экскурсій, якія расказваюць аб ролі тэатра ў гісторыі краіны і яе культуры. Гэта дзіцячыя праграмы, якія маюць яскравы нацыянальны змест. Безумоўна, гэта і тое, што мы найперш прапануем для паказу за мяжой сваё, нацыянальнае, і балет, і оперу. Прыклад таму — нядаўні паказ аднаго з найлепшых нашых спектакляў «Дзікае паляванне караля Стаха» ў Вялікім тэатры Расіі. З'яўленне такіх спектакляў, дзякуючы якім можна пазнаёміцца з культурай нашай краіны, — найважнейшы напрамак. Безумоўна, нашы артысты, якія ўдзельнічаюць у пастаноўках Расійскай Федэрацыі, сёння таксама з'яўляюцца, без фальшывага пафасу, праваднікамі нацыянальнай ідэі, дэманструюць стан беларускага музычнага, тэатральнага мастацтва. Толькі што ў Самары завяршыўся ўнікальны праект — фестываль опернага мастацтва «Славянскі дом», дзе ўдзельнічалі не толькі нашы артысты ў расійскіх оперных пастаноўках, такіх як «Князь Ігар», «Пікавая дама», «Барыс Гадуноў», але і ў гала-канцэрце быў прадстаўлены цэлы шэраг беларускіх партытур з арыямі і дуэтамі — з «Дзікага палявання караля Стаха», «Сівой легенды». На маё здзіўленне, у Самарскім тэатры захаваўся і ідзе спектакль «Мядзведзь» беларускага кампазітара Сяргея Картэса. Так што на сёння Вялікі тэатр годна прэзентуе нацыянальную культуру і наша выканальніцкае майстэрства за межамі краіны.

СТАР. 5

Спажывец

# ПЕРШЫЯ ВІТАМІНЫ СЕЗОНА

## Прыцэнімся да маладой зеляніны

**Тэрмін «антыаксіданты» з'явіўся адносна нядаўна, але яшчэ ў антычнасці людзі высветлілі вопытным шляхам тое, што сёння пацвярджаюць навукоўцы: свежая зяляніна — важны кампанент здаровага рацыёну. Асабліва яна неабходная ў перыяд звычайнага для нашай кліматычнай зоны вясновага авітамінозу.**

СТАР. 3



# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Вялізны бюджэтны дэфіцыт ЗША ўяўляе «значныя рызыкі» для сусветнай эканомікі




Міжнародны валютны фонд (МВФ) папярэдзіў ЗША, што іх вялізны бюджэтны дэфіцыт распальвае інфляцыю і ўяўляе «значныя рызыкі» для сусветнай эканомікі. Аб гэтым піша Financial Times. МВФ апублікаваў справаздачу Fiscal Monito. Згодна з дакументам, фонд чакае, што налета ў ЗША будзе зафіксаваны дэфіцыт бюджэту ў памеры 7,1 працэнта, што больш чым утрая перавышае сярэдні паказчык у 2 працэнты для іншых краін з развітой эканомікай. Злучаныя Штаты ўвайшлі ў лік краін, якія, лічаць у МВФ, «маюць вялікую патрэбу ў прыняцці палітычных мер для ліквідацыі фундаментальнага дысбалансу паміж расходамі і даходамі». Паводле звестак Галоўнага кантрольнага ўпраўлення ЗША, на канец 2023-га фінансавага года аб'ём федэральнага доўгу ЗША складаў $26,2 трлн, ці 97 працэнтаў ад ВУП. Чакаецца, што ў 2029-м ён дасягне 116 працэнтаў. Пры захаванні бягучай палітыкі ў адносінах да даходаў і расходаў можа адбыцца рост дзярждоўгу да 200 працэнтаў.

## У Індыі пачаўся першы этап маштабных парламенцкіх выбараў

ISSN 1990 - 763X

Пачалі работу 187 тысяч выбарчых участкаў у 102 акругах, якія размешчаны ў 21 штаце. Прагаласаваць могуць больш як 166 мільёнаў грамадзян краіны. CNN піша, што гэта найбуйнейшыя выбары ў гісторыі чалавецтва. Данае агульнанацыянальнае галасаванне «лічыцца адным з найважнейшых за апошнія дзесяцігоддзі». З улікам памеру краіны і 969 мільёнаў чалавек, якія маюць права галасаваць, а таксама з меркаванняў бяспекі, выбары ў Індыі пройдуць у сем этапаў. Апошні запланаваны на 1 чэрвеня. На першым этапе выбараў будзе вырашана, хто зойме 102 крэслы ў ніжняй палаце парламента Індыі — Лок Сабхе, якая ўключае 543 месцы. За іх змагаюцца 1625 кандыдатаў. Сярод фаварытаў галасавання — кіравальная Індыйская народная партыя («Бхарата джаната парты», БДП). Яе лідарам з'яўляецца цяперашні прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі. Ён прэтэндуе на трэці прэм'ерскі тэрмін.

## Інжынер Boeing: «Сотні людзей могуць загінуць, калі кампанія не вырашыць праблемы з якасцю»




Сэм Салехпур, які прапрацаваў у Boeing больш чым 10 гадоў, выступіў на слуханні па справе кампаніі ў амерыканскім Кангрэсе. Ён паведаміў, што заўважыў праблему са шчылінамі паміж ключавымі часткамі ашалёўкі самалётаў 787 Dreamliner. Паводле яго слоў, няспраўнасць закранае больш як тысячу самалётаў, якія знаходзяцца ў эксплуатацыі. «Я шчыра перакананы, што калі праблемы з бяспекай, якія я назіраў у Boeing, не будуць вырашаны, можа адбыцца катастрафічная паломка, і гэта прывядзе да страт сотняў жыццяў», — сказаў Салехпур. Ён таксама зазначыў, што ў Boeing адсутнічае культура бяспекі, а супрацоўнікаў, якія звяртаюць увагу на тэхнічныя недапрацоўкі, «ігнаруюць, маргіналізуюць, падвяргаюць пагрозам, адхіляюць і нават горш». Інжынер паведаміў, што і сам быў падвергнуты пагрозам фізічнай расправы з боку кіраўніцтва пасля таго, як публічна выказаў свае апасенні.

## КОРАТКА

- **У студзені — сакавіку 2024 года арганізацыямі ўсіх форм уласнасці пабудавана 8,2 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 787,5 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля.**
- Раннімі яравымі збожжавымі ў Беларусі засеяна больш як 88 працэнтаў плошчаў.
- **Уезду ў Літву чакаюць больш за 1,3 тысячы адзінак грузавога транспарту.**
- Унікальныя графіці знайшлі ў Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку. Адзін з надпісаў з'яўляецца сенсацыйным.
- **Нарыхтоўка суцэльнай донарскай крыві, а таксама эрытрацытных і трамбацытных кампанентаў крыві ў 2023 годзе ў Беларусі стала максімальнай за ўсю гісторыю краіны.**

Абітурыент-2024

# КРОК ДА ПОСПЕХУ

## Усе падрабязнасці ўступнай кампаніі ў прафесійна-тэхнічныя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы

**На нядаўняй нарадзе аб стане і развіцці прамысловасці кіраўнік дзяржавы зноў узняў пытанне аб дэфіцыце працоўных кадраў: «Усё важна: інвестыцыі, тэхналогіі, якасць прадукцыі. Але важней за ўсё — кадры, кадры і яшчэ раз кадры. Высакакласны спецыяліст вырашыць любую праблему, недавучка загубіць справу». І падкрэсліў, што размова сёння ідзе не аб якасці падрыхтоўкі кадраў, а аб іх павальным дэфіцыце, асабліва рабочых.**



Падняць прэстыж працоўнай прафесіі — задача няпростая. Над яе вырашэннем б'юцца кіраўнікі і спецыялісты не аднаго ведамства. Уключыліся ў гэтую работу і самыя зацікаўленыя ў прытоку маладых кваліфікаваных працоўных кадраў — прадпрыемствы і арганізацыі, якія ў гэтых кадрах адчуваюць дэфіцыт.

СТАР. 2

# «Ва ўстаноўленыя тэрміны ўсе работы будуць выкананы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Наталля Качанава назвала галоўныя тэмы выязной нарады — кантроль за рэалізацыяй даручэнняў Прэзідэнта, дадзеных пры наведванні Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра ў 2021 годзе, выкананнем рамонтна-рэстаўрацыйных работ на яго аб'ектах і ў цэлым у аграгарадку. Таксама ў цэнтры ўвагі — разгляд зваротаў грамадзян.

Пасля абмеркавання рамонтна-рэстаўрацыйных работ у размове з журналістамі Наталля Качанава адзначыла, што на гэтым этапе па рэстаўрацыі Свята-Успенскага сабора ёсць некаторыя праблемныя пытанні.

«Таму я тут. Гэта, перш за ўсё, кантроль за выкананнем даручэнняў Прэзідэнта, якія былі дадзены пры наведванні Жыровічаў у 2021 годзе. Акрамя таго, вядома, да нас ёсць звароты грамадзян, якія гаварылі аб тым, што марудна вядуцца работы па рэканструкцыі і рамонце гэтага храма. Таму мы вызначылі дакладныя даты вытворчасці работ, завяршэння і распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі і, вядома, устанавілі тыя тэрміны, калі работы павінны быць завершаны. Па нарматыўных тэрмінах выканання работ, гэта 1 снежня бягучага года», — паведаміла Старшыня Савета Рэспублікі.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла, што гэтыя пытанні будуць узяты на строгі кантроль. «Мы, вядома, возьмем на кантроль вырашэнне ўсіх гэтых пытанняў, будзем кантраляваць тыя тэрміны, якія сёння мы прагаварылі разам, і мясцовыя органы ўлады, і Беларуская праваслаўная царква, — удакладніла яна. — Мы са свайго боку (члены Савета Рэспублікі) будзем кантраляваць гэтыя працэсы, і я думаю, што ва ўстаноўленыя тэрміны ўсе работы будуць выкананы».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «Патэнцыял раёна значна вышэйшы»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У той жа час Ігар Сергеенка падкрэсліў: не павінна атрымацца так, што пачатак года з'яўляецца абнадзейвальным, а ў канцы даводзіцца канстатаваць зусім іншы вынік. «Пачатак года ўсяляе пэўную ўпэўненасць і па развіцці жывёлагадоўчай галіны, і па будаўніцтве, — канкрэтызаваў спікер. — Вядома, ад развіцця эканомікі залежыць дабрабыт раёна. Але ў цэлым пачатак года пакуль аптымістычны».

Падчас пасяджэння размова таксама ішла і аб пунктах росту, сярод якіх у тым ліку інвестыцыі. «Фактычна раёнам не выконваецца задача «адзін раён — адзін праект», пастаўленая кіраўніком дзяржавы, дакладней сказаць, не адпавядае патрабаванням», — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Акрамя таго, Ігар Сергеенка звярнуў увагу і на неабходнасць развіцця сферы турызму і прадпрымальніцтва. «Мы ўсе ведаем, што Браслаўшчына — гэта жамчужына Беларусі, беларускае Паазер'е, — падкрэсліў ён. — У гэтым кірунку трэба рухацца. Развіваць сферу прадпрымальніцтва. Сёння гучала, што 40 % адлічэнняў у бюджэт ажыццяўляецца індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Таму ёсць перспектывы. Ёсць цікавасць, пакуль тэарэтычная, з боку інвестараў, у тым ліку расійскіх».

Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, турызм у Браслаўскім раёне павінен стаць усесезонным. «Сёння ў нас што адбываецца? Улетку — бум, а зімой — фактычна штыль», — апісаў бягучую сітуацыю ў турыстычнай сферы Браслаўшчыны Ігар Сергеенка.

Для развіцця ўсесезоннага турызму, па меркаванні спікера, неабходна ствараць адпаведныя ўмовы і будаваць новыя аб'екты. «А для таго, каб іх будаваць, трэба зарабіць дапамогу дзяржавы, зарабіць самім і прыцягнуць інвестараў, — заўважыў ён. — Ёсць некалькі аб'ектаў, якія сёння будуюцца, але гэтага недастаткова. Патэнцыял раёна значна вышэйшы — я маю на ўвазе прыродны».

**Паводле БелТА.**

Вяршыня народаўладдзя

# ГАРАНТ СТАБІЛЬНАСЦІ, РОСТУ І РОСКВІТУ



## Знаёмімся з дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу ад заканадаўчай улады

**Ужо праз некалькі дзён адбудзецца найважнейшая падзея, якая, несумненна, увойдзе ў гісторыю нашай краіны. Сёмы раз, але ўпершыню ў новым статусе, збяруцца дэлегаты Усебеларускага народнага сходу, каб абмеркаваць найважнейшыя пытанні, якія датычацца нашай роднай Беларусі, вызначыць кірункі, па якіх рухацца далей.**

У адпаведнасці са змяненнямі і дапаўненнямі, унесенымі ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках рэспубліканскага рэферэндуму 27 лютага 2022 года, Усебеларускі народны сход з'яўляецца канстытуцыйным органам. Цяпер гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя нашай краіны, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду.

У састаў УНС уваходзіць 400 дэлегатаў ад структур грамадзянскай супольнасці і 350 дэлегатаў ад мясцовых Саветаў дэпутатаў. Астатнія з'яўляюцца дэлегатамі найвышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя Беларусі згодна са сваёй пасадай. Сярод іх — прадстаўнікі заканадаўчай галіны ўлады: дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі.

Напярэдадні найважнейшай падзеі карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў парламентарыяў, з якім настроем заканадаўцы ідуць на Усебеларускі народны сход, чаго ад яго чакаюць.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Мікалай БУЗІН** адзначыў, што з асаблівай цікавасцю чакае Усебеларускага народнага сходу, бо, нягледзячы на тое, што гэта мерапрыемства традыцыйнае для нашай краіны, сёлета праводзіцца ў новым фармаце. «Спадзяюся, што гэты орган у перспектыве стане базісам для ўсёй структуры народаўладдзя Беларусі, — падзяліўся меркаваннем дэпутат. — Вечавыя традыцыі ў нас ёсць. Мы знайшлі спосаб заканадаўча замацаваць іх на ўзроўні дзяржавы. Перакананы, што сход стане той пляцоўкай, якая дазволіць выпрацаваць галоўныя кірункі для развіцця краіны на найбліжэйшую перспектыву. Магчыма, у далейшым гэта дазволіць не толькі паскорыць працэс станаўлення нашай дзяржаўнасці і яе развіцця, але і дасць магчымасць звярнуць увагу на тыя аспекты, якія мы раней проста апускалі. УНС — пляцоўка, дзе збяруцца прадстаўнікі ўсіх слаёў нашага грамадства. І мы, напэўна, упершыню за многія гады зможам гаварыць не толькі аб грамадзянскай супольнасці ў рамках функцыянавання гэтай пляцоўкі, але і ўдзелу ў ёй партый. Як гэты момант у перспектыве адаб'ецца на развіцці нашай краіны, казаць пакуль складана, але, спадзяюся, гэта будзе пазітыўна».

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Віктар АНАНІЧ** з нецярпеннем чакае гэтай найважнейшай падзеі. Ён быў дэлегатам пятага і шостага Усебеларускіх народных сходаў. «У новым, канстытуцыйным, статусе УНС збярэцца ўпершыню, таму работа будзе больш адказнай, напружанай і цікавай, — лічыць сенатар. — Сёмы Усебеларускі народны сход стане новым элементам палітычнай і прававой культуры беларускага народа, элементам узаемадзеяння з грамадзянскай супольнасцю і органамі ўлады, своеасаблівым калектыўным розумам, які вызначыць аптымальны варыянт развіцця. Наша грамадства ўжо прыйшло да таго ўзроўню ўладкавання, калі досвед тысяч людзей розных пакаленняў можна аб'яднаць у імя пошуку максімальна эфектыўнага шляху вырашэння глабальных стратэгічных задач».

Пры гэтым парламентарый падкрэсліў, што гэта будзе прыняцце менавіта стратэгічных рашэнняў, накіраваных на развіццё нашай краіны. «Але не толькі на вырашэнне ўнутраных праблем, а тых, якія мы павінны забяспечыць, працуючы на знешнім контуры, — дадаў ён. — Дэлегаты, напрыклад, разгледзяць новую Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну Беларусі. Чакаю, што Усебеларускі народны сход стане сур'ёзным народным канстытуцыйным кантролем над усімі працэсамі ў краіне. Усім галінам улады давядзецца лічыцца з яго рашэннямі. Ні ў адной краіне свету народ, усе пласты грамадзянскай супольнасці, заканадаўчай і выканаўчай улады не ўцягнуты да такой ступені ў кіраванне дзяржавай, як у нашай роднай Беларусі. Гэта орган сапраўднага народаўладдзя».

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Анжаліка КУРЧАК** добра памятае першае скліканне Усебеларускага народнага сходу, калі дзяржава ўзяла арыенцір на развіццё рыначнай эканомікі. «Пры гэтым мы прытрымліваемся асноўных кірункаў нашага развіцця ў плане фарміравання сацыяльна-арыентаванай дзяржавы, накіраванай на забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці і аказанне ўсемагчымага садзейнічання, сацыяльнай дапамогі многім катэгорыям насельніцтва, — удакладніла дэпутат. — Гэтага курсу, узятага на I Усебеларускім народным сходзе, мы прытрымліваемся ўвесь наш доўгі шлях».

Па словах парламентарыя, УНС — самы важны прадстаўнічы орган нашай дзяржавы, найвышэйшы інстытут народаўладдзя, і грамадства добра разумее яго функцыю і ролю. «Прыняцце таго ці іншага закона заўсёды заснавана на запыце грамадства, — канстатавала Анжаліка Курчак. — Таму, калі мы ўжо ўнеслі змяненні ў Канстытуцыю, то з упэўненасцю кажам аб тым, што гэта адлюстроўвае сённяшнія рэаліі. Усе прыглядаюцца, як, згодна з новым заканадаўствам, будзе працаваць Усебеларускі народны сход, таму інтарэс да яго вельмі высокі: ад простага чалавека да кіраўніка, які займае адказную пасаду. Абноўлены склад УНС, кампетэнцыя, цяпер асноўныя праграмныя дакументы, звязаныя з развіццём палітычнага, дзяржаўнага ўладкавання, будуць прымацца нашым усенародным веча. Гэта важна для захавання далейшай стабільнасці ў нашым грамадстве, для выпрацоўкі асноўных стратэгічных кірункаў далейшага росту і росквіту нашай краіны».

Як звярнуў увагу **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Глеб ЛАПІЦКІ,** Усебеларускі народны сход — гэта акурат тая пляцоўка, дзе будзе вырашацца стратэгічны кірунак развіцця нашай дзяржавы, дзе павінен быць пачуты голас кожнага чалавека. Сенатар старанна вывучаў склад УНС, сачыў за момантам вылучэння дэлегатаў. «Гэта людзі зусім рознага ўзросту, светаўспрымання, аднак усіх нас аб'ядноўвае адно — імкненне да развіцця нашай дзяржавы як у глабальных, так і ў лакальных маштабах, — лічыць ён. — Калі будзе мір, дабрабыт, нацыянальная і харчовая бяспека, высокія эканамічныя паказчыкі, то будзе і духоўнае развіццё, а гэта ўжо нацыянальная культура і творчасць».

Глеб Лапіцкі падкрэсліў, што Усебеларускі народны сход, які збярэцца на наступным тыдні, з'яўляецца архіважнай падзеяй для ўсяго беларускага народа, падзеяй, да якой будуць прыкаваны погляды ўсёй сусветнай супольнасці. «Беларусь зноў стане эпіцэнтрам усяго палітычнага жыцця свету, — заўважае сенатар. — Мы можам шмат казаць, шмат абмяркоўваць, аднак лепш за ўсё правесці Усебеларускі народны сход, чым, як у некаторых іншых краінах, толькі казаць пра дэмакратыю і рабіць зусім супрацьлеглае. Менавіта таму ў нас ёсць такі орган. І, мне здаецца, ён будзе вельмі дзейсны. Як казаў наш Прэзідэнт, гэты орган ствараецца для таго, каб адвесці краіну ад прорвы ў самы крытычны момант. Значыць, важна яго пазіцыянаваць на ўвесь свет».

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Алег РАМАНАЎ** перакананы: на Усебеларускім народным сходзе будзе стварацца гісторыя. «Тым самым, я як асобны чалавек буду датычны да гісторыі беларускай дзяржавы, а ў перспектыве — і сусветнай гісторыі, — заўважыў ён. — Упэўнены, што ў нашай краіне, на постсавецкай прасторы цяпер ствараецца будучыня свету. І ад таго, як мы адпрацуем, якія рашэнні прымем, залежаць шляхі, па якіх пойдзе Рэспубліка Беларусь, наступныя пакаленні грамадзян нашай краіны. Ад гэтага залежыць, па якім шляху, магчыма, пойдзе і наш усходне-славянскі рэгіён, у цэлым сусветная гісторыя».

Алег Раманаў таксама з'яўляецца старшынёй Беларускай партыі «Белая Русь», старшынёй рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Сярод дэлегатаў УНС ад грамадзянскай супольнасці — 80 членаў гэтага грамадскага аб'яднання, сярод партыйных дэлегатаў УНС ад мясцовых Саветаў дэпутатаў пераважаюць члены партыі «Белая Русь».

«Нягледзячы на тое, што наша партыя мае адносна невялікую гісторыю (2 мая будзе адзін год, як мы існуем), за гэты час ужо паспелі заваяваць аўтарытэт у шэрагах беларускай грамадзянскай супольнасці, у цэлым у беларускім грамадстве, — патлумачыў шырокую прадстаўленасць ва УНС членаў партыі «Белая Русь» яе лідар. — Вялікая колькасць аўтарытэтных людзей, якія займаюць значныя сацыяльныя пазіцыі, пэўныя пасады ў нашай краіне, з'яўляюцца членамі партыі. Абсалютна невыпадкова, што іх выбралі ў якасці дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Адным з прынцыпаў вылучэння людзей у якасці дэлегата з'яўляецца прафесіяналізм. Важна, каб чалавек адбыўся ў сваёй прафесіі, праявіў сябе на высокім узроўні не толькі як прафесіянал, але і патрыёт. І сярод членаў нашай партыі такіх пераважная большасць».

Для **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Марыны ІЛЬІНОЙ** удзел ва Усебеларускім народным сходзе — ганаровая місія. «Адчуваю цяжар адказнасці, які на мяне ўскладзены не толькі як на сенатара, але і як на педагога, прадстаўніка сваёй прафесіі, — падзялілася парламентарый. — Бачу сваю задачу не толькі ў тым, каб прыняць удзел у самым значным для краіны мерапрыемстве, але і ў тым, каб несці адказнасць за рэалізацыю і ажыццяўленне рашэнняў, якія будуць прыняты. Чакаю важнага, сур'ёзнага і запамінальнага форуму, перспектыўных, скіраваных у будучыню рашэнняў. Цудоўна, што Усебеларускі народны сход адбудзецца менавіта вясной, калі ў нас асабліва моцная вера ў лепшае».

Па словах сенатара, тое, што ўпершыню Усебеларускі народны сход адбудзецца ў канстытуцыйным статусе, накладвае асаблівую адказнасць на яго ўдзельнікаў. «Бо ад нашых рашэнняў залежыць лёс краіны, усяго народа, — патлумачыла дэпутат. — Максімальна шырокае прадстаўніцтва дэлегатаў сходу гарантуе ўзважанасць, аб'ектыўнасць і законнасць рашэнняў, якія будуць прыняты, што, безумоўна, надасць новы імпульс дзяржаўнаму развіццю. Думаю, што рашэнні сходу стануць лёсавызначальнымі, бо з'яўляюцца адлюстраваннем меркавання ўсяго беларускага народа».

**Вераніка КАНЮТА.**

Вялікая будоўля

# РЭЖЫМ НОН-СТОП ПАЎНОЧНАЙ СТАЛІЦЫ

**Сёлетні год для горада на Дзвіне напоўнены мноствам значных падзей і юбілеяў. Цяпер у Віцебску ўся інфраструктура актыўна рыхтуецца да 1050-годдзя горада, Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Нягледзячы на ўмовы надвор'я, якія рэзка змяняюцца ад красавіцкага цяпла да не па-вясноваму зімняй завеі, увесь горад падобны на адну вялікую будоўлю. А цэнтр, дзе размяшчаюцца значныя сацыяльныя аб'екты, паходзіць на мурашнік, у якім і днём і ноччу шчыруюць спецыялісты.

### Зайграе фарбамі амфітэатр

Мадэрнізацыю галоўнай фестывальнай пляцоўкі — Летняга амфітэатра, які з'яўляецца сімвалам форуму мастацтваў, — плануюць правесці ў два этапы. Цяпер новае аблічча набывае закулісная прастора сцэны. Пасля «Славянскага базару» зоймуцца дахам над глядзельнай залай, заменяць полікарбанат, апрацуюць усе металаканструкцыі, установяць дэкаратыўную падсветку і новыя крэслы ў чатырох сектарах.

А вось у культурна-спартыўным цэнтры амфітэатра ўжо сёння поўным ходам вядуцца работы па дэмантажы лесвіц, даху, інжынерных сетак, каб да пачатку канцэртнага сезона гэты аб'ект звонку здабыў сучаснае аблічча. Таксама каля культурна-спартыўнага цэнтра, згодна з праектам, з'явіцца дзіцячы інтэрактыўны гарадок. А падчас правядзення буйных мерапрыемстваў тут плануюць арганізаваць фуд-прастору.

### Самая вялікая плошча ў Беларусі

Плошча Перамогі, якая з'яўляецца самай вялікай у краіне і адной з найбуйнейшых у СНД, таксама сустрэне лета ў новым выглядзе. Там плануюць устанавіць унікальны для горада плоскасны фантан з падсветкай. Цяпер на плошчы вядуцца работы па прыладзе чар пад фантаны, манціруюцца падмуркі пад дзве помпавыя станцыі, пачынаюцца маналітныя работы па заліванні чары пад басейн. Далей на чарзе ўстаноўка фарсунак для фантанаў, якіх будзе 118, напрыканцы адновяць пліткавае пакрыццё.

Згодна з канцэпцыяй праекта, фарсункі будуць размешчаны групамі па тры рады з прамежкам у цэнтры для апраўлення візуальнай дамінанты — манумента «Тры штыкі». Максімальная вышыня бруй — пяць метраў. Фантан будзе дынамічным: колер бруй, іх вышыня і дынаміка змогуць змяняцца па запраграмаваных сцэнарыях, уключаючы тэматычныя святломузычныя праграмы для розных свят: Дня Перамогі, Дня горада, фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» і іншых.

На фасадзе цэнтральнага дома ўжо абнавілі надпіс «Подвиг советского народа бессмертен!», а некалькі дзён таму работнікі камунальных службаў паклалі на праспекце новае асфальтавае палатно.

### Цэнтр культуры і дзелавых сустрэч

Будаўнічыя работы ў канцэртнай зале «Віцебск» выходзяць на фінішную прамую. З сярэдзіны мая пачнецца камплектацыя абсталяваннем і мэбляй. Памяшканні на трэцім паверсе ўжо гатовыя, там засталося толькі ўстанавіць сістэму кандыцыянавання. Аздабленне ў круглай зале і прылеглым да яе фае на 90 працэнтаў выканана. Дызайн памяшканняў будзе кардынальна адрозніваецца ад ранейшага. У аздабленні выкарыстоўваюцца кампазітныя матэрыялы, шкло, у залах з'явіцца шмат люстэркаў, цікавае і яркае падсвечванне.

Да канца месяца аб'ект зайграе новымі фарбамі. З'явіцца таксама іншае дэкаратыўнае падсвечванне адміністрацыйнага будынка і пешаходнага мастка.

Толькі на рэканструкцыі канцэртнай залы будзе асвоена больш як 80 мільёнаў рублёў. Такую лічбу агучыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін на абласным штабе па падрыхтоўцы аб'ектаў да Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

### Гістарычны брэнд у сучаснай апрацоўцы

Гасцініца «Віцебск», якая прымае гасцей з 1973 года, зменіцца да непазнавальнасці. Фасад будынка захавае першапачатковае аблічча, але да яго гістарычнага вобразу будуць дададзены яркія фарбы, выкананыя з выкарыстаннем сучасных тэхналогій — падсвечвання, аздаблення і вітражоў. З'явіцца новая зручная стаянка для аўтобусаў. Для яе будаўніцтва прыйшлося зрэзаць старыя дрэвы, аднак замест іх будуць зроблены кампенсацыйныя пасадкі. У выніку рэканструкцыі абновіцца ландшафтная арганізацыя тэрыторыі, зменіцца схема аўтамабільнага руху каля гасцінічнага комплексу.

Лагістыка руху гасцей у холе не зведае істотных змен, але дзякуючы навацыям стане больш зручнай. На цэнтральным уваходзе плануюць устанавіць дзверы рэвальвернага тыпу (аўтаматычныя дзверы круглай канструкцыі са створкамі, як пялёсткі вакол цэнтральнай восі). Абновіцца зона прыёму і рэгістрацыі гасцей. Хол напоўніцца сэрвіснымі аб'ектамі: банкаматам, кава-аўтаматам, цырульняй. Скароціцца колькасць, але павялічыцца грузападымальнасць ліфтаў: іх будзе два, яны змогуць адначасова развезці па паверхах 24 чалавекі.

Усяго да паслуг гасцей плануюць адкрыць 201 нумар на 290 месцаў. У тым ліку шэсць нумароў падрыхтаваны для прыёму асоб з абмежаванымі магчымасцямі. Навеўвядзенне — нумары-студыі, дзе прадугледжаны невялікая кухня, гасцёўня, спальня, пашыраная ванная. Іх галоўная «разынка» — панарамныя вокны, дзякуючы чаму госці атрымаюць дадатковы бонус у выглядзе незабыўнага віду на старажытны горад і берагавую лінію Заходняй Дзвіны.

У перспектыве плануецца прайсці сертыфікацыю гасцінічных паслуг і пацвердзіць адпаведнасць патрабаванням катэгорыі «тры зоркі». Галоўнае, што пасля такой маштабнай перазагрузкі кошт пражывання не выйдзе за межы сярэдняга сегмента.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# КРОК ДА ПОСПЕХУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Якія прагнозы на гэты конт ва ўстановах адукацыі, як ідзе падрыхтоўка да ўступнай кампаніі, колькі патэнцыяльных кваліфікаваных кадраў гатовы прыняць на навучанне беларускія каледжы — аб гэтым размова з **начальнікам упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандрай ПЯТРОВАЙ.**

***— Аляксандра Мікалаеўна, давайце пачнём з галоўнага. У Беларусі другі год дзейнічае Кодэкс аб адукацыі. Што змянілася з яго прыняццем для выпускнікоў дзявятых класаў і абітурыентаў каледжаў?***

— Агульная адукацыя стала ўсеагульнай. У роўнай ступені для тых, хто вырашыў заканчваць 11 класаў, так і для тых, хто пакіне школьныя сцены і працягне адукацыю або на ўзроўні прафтэха, або сярэдняй спецыяльнай. У любым выпадку, паступаючы на аснове агульнай базавай адукацыі, навучэнец асвоіць адукацыйную праграму агульнай сярэдняй адукацыі. Акрамя таго, разам з Кодэксам аб адукацыі была поўнасцю абноўлена структура спецыяльнасцяў і змест адукацыйных праграм.

***— Колькі каледжаў на ўзровень ССА гатовы прыняць абітурыентаў у гэтым годзе?***

— 162 установы ССА і 36 іншых устаноў адукацыі, якія таксама працуюць у сферы сярэдняй спецыяльнай адукацыі — гэта філіялы ўніверсітэтаў, Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, гімназіі-каледжы мастацтваў, вучылішча Алімпійскага рэзерву. План прыёму на 2024 год ужо сфарміраваны. І ён будзе амаль такі ж, як і сёлета. Праўда, мы ўнеслі карэкціроўкі па аб'ёме і структуры прыёму.

Набор на бюджэтныя месцы павялічыцца ў параўнанні з мінулым годам і складзе амаль 29 тысяч чалавек. Колькасць платных месцаў прапарцыянальна скароцяць: замест леташніх 12,2 тысячы чалавек у 2024-м на ўмовах аплаты плануюць залічыць на навучанне 10,2 тысячы чалавек. На дзённую форму будзе значна большы набор на аснове агульнай базавай адукацыі — 19,9 тысячы чалавек, крыху менш на аснове агульнай сярэдняй — 6,8 тысячы чалавек. Таксама плануем на бюджэт прыняць 1,2 тысячы завочнікаў, з улікам прыёму па спецыяльнасцях кірунку адукацыі «Сельская гаспадарка» — 1,6 тысячы чалавек і каля трох тысяч завочнікаў на платнай аснове.

У правілах прыёму, якія ўступілі ў сілу ў 2024 годзе, павялічаны парог для прыёму на мэтавае навучанне. Раней мэтавікі складалі да 30 % на ўсіх спецыяльнасцях, а па профілях «Сельская гаспадарка» і «Ахова здароўя» — да 60 %. Цяпер па ўсіх спецыяльнасцях лічбы прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі павялічаны да 50 працэнтаў, па спецыяльнасцях сферы сельскай гаспадаркі і аховы здароўя ранейшы парог захаваўся.

***— Сёння патрабаванні наймальнікаў не тыя, што былі 10—20 гадоў таму. На вытворчасці, у арганізацыях іншых сфер эканомікі чакаюць спецыялістаў прынцыпова новага ўзроўню.***

— У гэтым годзе будзе ажыццяўляцца прыём па новых спецыяльнасцях ССА. Напрыклад, «Тэхнічная эксплуатацыя мехатронных сістэм электроннай вытворчасці», «Вытворчасць вырабаў мікра- і нанаэлектронікі» з прысваеннем кваліфікацыі «Вымяральнік электрафізічных параметраў вырабаў электроннай тэхнікі 5-га разраду». Такім будуць навучаць ва ўстанове адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж лічбавых тэхналогій». «Эксплуатацыя сродкаў вымярэння» — такая новая спецыяльнасць з'явіцца сёлета ў філіяле «Каледж сучасных тэхналогій у машынабудаванні і аўтасэрвісе» ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі». Новая спецыяльнасць «Лабараторны аналіз» плануецца ва УА «Гомельскі дзяржаўны хіміка-тэхналагічны каледж». У цэлым па краіне ў 2024 годзе 16 устаноў ССА пашырылі на 17 пазіцый пералік спецыяльнасцяў, па якіх будуць ажыццяўляць падрыхтоўку.

Зменлівую патрэбу рэгіянальных рынкаў працы мы адсочваем пастаянна і хутка рэагуем. У бягучым годзе прыпынены прыём па кваліфікацыях прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Пры гэтым адкрыта падрыхтоўка па 149 новых для асобных устаноў адукацыі кваліфікацыях.

Акрамя таго, сёлета ў каледжах уводзяць новую спецыяльнасць для прыцягнення да працоўнай дзейнасці маладых людзей з адхіленнямі ў здароўі — «Фларыстычны дызайн» з прысваеннем кваліфікацыі «Фларыст» трэцяга разраду.

***— Якія спецыяльнасці найбольш папулярныя ў абітурыентаў?***

— На ўзроўні ССА папулярныя спецыяльнасці, якія звязаны з інфармацыйнымі тэхналогіямі, сферай аховы здароўя, педагогікі. Расце папулярнасць тэхнічных спецыяльнасцяў для высокатэхналагічных галін. Традыцыйна высокі конкурс на спецыяльнасці сферы мастацтва, архітэктуры.

На ўзроўні ПТА больш як 70 працэнтаў абітурыентаў паступаюць на спецыяльнасці профілю адукацыі «Інжынерныя, апрацоўчыя і будаўнічыя галіны», яшчэ 13 працэнтаў — па профілі «Сельская, лясная, рыбная гаспадарка і ветэрынарыя». У цэлым каля 75 працэнтаў у структуры падрыхтоўкі кадраў займаюць спецыяльнасці рэальнага сектара эканомікі. Хачу адзначыць, што сур'ёзных карэкціровак па наборы навучэнцаў па агучаных профілях у 2024 годзе не плануецца.

***— Колькі каледжаў гатовы прыняць абітурыентаў на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі?***

— У Беларусі прыём будуць ажыццяўляць 154 каледжы, тры філіялы ўстаноў вышэйшай адукацыі і філіял УА «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі».

Плануем прыняць у цэлым 26,8 тысячы чалавек: 25,7 — на дзённую форму, завочную — 300, вячэрнюю — 776 і дыстанцыйную —15 чалавек. Гэтыя лічбы, як і статыстыка гэтага года па ССА, крыху вышэйшыя за сто працэнтаў да ўзроўню мінулага года. Дарэчы, сёлета мы працягваем тэндэнцыю павелічэння долі прыёму на аснове агульнай базавай адукацыі — дзесьці на 4,5 працэнта. Лічба невялікая, але рост паслядоўна адбываецца ўжо не першы год.

***— Калі пачнецца прыём дакументаў?***

— Сёлета каледжы будуць прымаць дакументы на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай з 20 ліпеня да 3 жніўня за кошт сродкаў бюджэту. А таксама платнікаў, якія здаюць творчыя іспыты: на аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі з 20 ліпеня да 13 жніўня для любых катэгорый.

На ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі прыём дакументаў пачынаецца 15 чэрвеня і працягнецца да 23 жніўня.

***— У правілах прыёму нешта змянілася?***

— Залічэнне абітурыентаў, як і раней, будзе праходзіць па конкурсе на аснове сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. Па творчых і спартыўных спецыяльнасцях на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі неабходна здаваць адпаведныя ўступныя іспыты. Разам з тым з 2023 года адкрылася магчымасць ажыццявіць дадатковы набор на месцы, якія пасля залічэння абітурыентаў на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі засталіся вакантнымі. Таксама працягнецца практыка падаўжэння прыёму на ўзровень сярэдняй прафесійнай адукацыі да 15 верасня ў тых установах адукацыі, дзе навучальныя групы не ўкамплектаваны поўнасцю. Ёсць яшчэ адзін важны нюанс — з мінулага года таксама стала магчыма павялічыць колькасць прыёму абітурыентаў на найбольш запатрабаваныя ў эканоміцы краіны спецыяльнасці ў дзённай форме навучання. Для гэтага мы выкарыстоўваем інфармацыю, якую атрымліваем ад арганізацый — заказчыкаў кадраў. І калі па гэтай інфармацыі такая патрэба ёсць, павялічваем колькасць месцаў. У мінулым годзе такім чынам мы прынялі дадаткова 500 абітурыентаў.

***— Што б вы пажадалі выпускнікам школ?***

— У кожнага павінна быць мара. Дабіцца вышынь у кар'еры, стаць значным і паважаным — вынаходнікам або канструктарам, архітэктарам або аўтамабільным магнатам. Адважвайцеся! Але памятайце аб тым, што многія з прамыслоўцаў з сусветным імем зрабілі свой першы крок да поспеху і славы ў якасці рабочых. У нашай краіне для моладзі створаны ўсе ўмовы, каб ісці далей і наперад, развівацца і ўдасканальвацца. Галоўнае — зрабіць першы крок і знайсці сябе ў прафесіі.

І з прыземленага: самы доўгі працэс у падрыхтоўцы да паступлення — гэта праходжанне медкамісіі і атрыманне неабходных даведак. Так што не зацягвайце, прыступайце да гэтага загадзя.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**



**Лічбы**

**У 2023/2024 навучальным годзе ў Беларусі навучаюцца 107,8 тысячы навучэнцаў 9-х класаў і 57,5 тысячы 11-х класаў.**

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Предмет аукциона – лот:** капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15042 (наименование: коровник-телятник ферма Житин; назначение: здание специализированное животноводства), площадью 1259,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Степанковский с/с, 7, вблизи д. Житин, западнее, на земельном участке с кадастровым номером 122583000002000047, площадью 1,6259 га, составные части и принадлежности: пристройка

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 16 700,00 | Размер задатка, руб. | 1 670,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Орепичи», 225117, Брестская обл., Жабинковский р-н, д. Орепичи, ул. Тимофея Лося, 9, тел./ф 80164168034. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. Условия продажи: без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 21 мая 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 20 мая 2024 г. до 17.00.**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего**
**ОАО «Агросервис»**
(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)

Аукцион состоится **08.05.2024 в 11.00** по адресу:
**г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352** (офис Организатора аукциона)

Лот № 1: **капитальное строение с инв. № 700/С-50207 – здание шиномонтажного цеха и склада автошин,** пл. 423,2 кв. м, назначение: здание нежилое, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/2. **Капитальное строение с инв. № 700/С-50202 – здание агрегатного комплекса**, пл. 65 кв. м, назначение: здание нежилое, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44А. **Капитальное строение с инв. № 700/С-50200 – здание кузнечного участка**, пл. 37 кв.м., назначение: здание нежилое, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а. **6/100 доли капитального строения с инв. № 700/С-117992 – промышленная площадка для стоянки автомобилей** (пл. всего капитального строения 17110,5 кв. м, назначение: сооружение специализированное транспорта, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5. Составные части и принадлежности: сооружение промышленной площадки для стоянки автомобилей). **Пожарный щит,** состав: лопата 1 шт., ведро 2 шт., огнетушитель 1 шт., багор 2 шт. **Установка для демонтажа шин**, 1995 г. в., инв. № 611. **Установка проверки герметичности шин**, 1995 г. в., инв. № 613. **Печь газогенераторная Бренеран АОТ-19 тип 04**, 2017 г. в., инв. № 952. **Пресс гидравлический**, 1974 г. в., инв. № 053. **Пресс гидравлический**, 1974 г. в., инв. № б/н. **Таль электрическая**, г/п 2 т, 1974 г. в., инв. № 68. **Верстак металлический,** инв. № 171. **Шкаф металлический**, инв. № 166.

**Сведения о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000007006131 (право аренды, площадь 3,3041 га; целевое назначение земельного участка: земельный участок для строительства и обслуживания зданий и сооружений; ограничения (обременения) прав: постоянный и бессрочный сервитут для прохода, проезда к доминантному объекту (пл. 0,0410 га). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.

**Начальная цена продажи: 187 534,40 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 18 753,44 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа 40901.

Срок подачи документов до 12.00 07.05.2024. Срок подписания договора купли-продажи 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

**Информация о проведении аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44 |
| Дата, время и место проведения аукциона | 20.05.2024, 12.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг» |
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды недвижимого имущества – части капитального строения с инвентарным номером 644/С-3766** |
| Общая площадь, кв. м | 3 267,31 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 63 (1 этаж) |
| Характеристика недвижимого имущества и иные сведения | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, погрузочно-разгрузочные рампы, подъездные пути |
| **Условия аукциона** | **Целевое использование имущества – организация деятельности в соответствии с законодательством, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, складского помещения, организации производства (кроме вредных производств), организации общественного питания, оказания услуг (за исключением ритуальных), розничной торговли продовольственными и (или) непродовольственными товарами (за исключением осуществления розничной торговли комиссионными товарами, товарами, бывшими в употреблении, размещения игорных заведений)** |
| Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб. | 2 901,37 |
| Сумма задатка, руб. | 2 901,37 |
| Срок договора аренды | 5 лет |
| Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем | 3,0 – для торговых и складских площадей (2 598,91 кв. м); 0,5 – для площадей погрузочно-разгрузочной рампы (668,4 кв. м) |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44,** финансовый отдел, с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по **17 мая 2024 г. включительно,** телефоны: **8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.** Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by (https://au.nca.by),** Солигорского районного исполнительного комитета – **www.soligorsk.gov.by** (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – **www.soligorsktorg.by** (Главная/Аукционы).

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 017 516-80-61)
**по поручению КУП «Универмаг «Слуцк»**
(продавец, место нахождения: Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 175, тел.: (01795) 2-98-74, 5-53-62),

**проводит повторный открытый аукцион по продаже изолированного помещения с инв. № 640/D-27989 (магазин № 60)**
**общей площадью 267,3 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. Ленина, 313-61**.

Начальная цена без НДС **– 372 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 37 200,00** бел. руб.
**Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by, rlt.by.**
Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 16.03.2024.

Аукцион состоится **07.05.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.05.2024** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (8017 95) 5-53-98, (8029) 395-22-98.** УНП 600154568

Імпартазамяшчэнне

# Шлях ад поля да талеркі

**Талачынскі кансервавы завод славіцца не толькі смачнымі яблычнымі ды ягаднымі сокамі, нектарамі і віннай прадукцыяй, але і бульбай. А нядаўна на прадпрыемстве пачалі выпускаць паўфабрыкаты бульбы фры, таму ўжо наведвальнікі вядомых сетак фаст-фуду могуць быць запэўненыя ў тым, што гарачыя залацістыя долькі ад самай зямлі беларускія — натуральныя.**



## ЗАЧЫН БУДУЧАГА ЎРАДЖАЮ

10 красавіка Талачынскі завод, уладальнік самага вялікага бульбянога поля краіны, прыступіў да пасадкі «другога хлеба». У ваколіцах вёскі Трацылава на плошчы з папярэдне нарэзанымі разорамі выйшлі чатыры пасадачныя агрэгаты, з кожным днём колькасць тэхнікі, задзейнічанай на пасадцы, павялічваецца. А такіх бульбасеялак у прадпрыемства дзесяць адзінак.

Сёлета аграрыі кансерваага завода будуць вырошчваць свой брэнд агародніны на плошчы ў адну тысячу гектараў. У бягучым годзе пасадку пачалі раней — гэтаму паспрыяла надвор'е: зямля на грэбні прагрэлася да 9-10 градусаў. Вырошчванне бульбы — няпросты тэхналагічны працэс, але вопытныя талачынскія працаўнікі ўсе этапы вывучылі даўно і давялі да аўтаматызму. Падрыхтоўка глебы пачалася з восені, своечасова ўнеслі калійныя ўгнаенні, гліфасаты і апрацавалі ад захворванняў пасадачны матэрыял. Цяпер, захоўваючы тэхналогію пасадкі, на палях гаспадаркі штодзень шчыруюць механізатары.

Акцэнт у бягучым сезоне зроблены на вырошчванні пяці сартоў як айчыннай, так і замежнай селекцыі: «Інаватар», «Гала», «Юлія», «Мастак» і «Чэленджар». Ва ўсіх — розныя групы спеласці, для завода важна як мага раней атрымаць першы ўраджай для вытворчасці бульбы фры. Менавіта пад іх у гаспадарцы адводзіцца пераважная частка палёў, невялікія плошчы разлічаны пад вырошчванне харчовых сартоў і бульбы на насенне.

Адначасова з пасадкай вядзецца ўзворванне, уносяцца фосфарныя ўгнаенні, наразаюцца барозны. У ліку тых, хто першым выйшаў на палі ў новым аграрным сезоне, — механізатар Яўген Шкуратаў. «Наша задача — справіцца ў аптымальныя тэрміны. Надвор'е хоць і радавала цяплом у пачатку красавіка, цяпер ноччу — «мінус». Але тэхніка падвесці не павінна: сам узімку даводзіў да ладу пасадачны агрэгат», — дзеліцца настроем на сезон-2024 механізатар.

## НОВЫ ПАДЫХОД

Стравы з «другога хлеба» даўно сталі нацыянальнай «разынкай» беларусаў, але бульба фры да нядаўняга часу заставалася непакоранай вяршыняй. Гэту задачу нарэшце вырашыў менавіта Талачынскі кансервавы завод. У 2022 годзе тут запусцілі лінію па вытворчасці паўфабрыкатаў, магутнасць якой дазваляе выпускаць дзве тоны прадукцыі ў гадзіну.

Перафармаціраванне сусветных рынкаў паставак і лагістыкі ў 2022 годзе канчаткова падштурхнула прадпрыемства да таго, каб стаць буйным пастаўшчыком бульбы фры на экспарт і ўнутраны рынак, замясціўшы пастаўкі з-за мяжы. Ад ідэі да запуску лініі прайшло тры гады. Для вытворчасці пабудавалі новы цэх, замовілі ў шведскай кампаніі па выпуску абсталявання лінію. Стартаваў буйны і, як паказаў час, паспяховы праект 29 кастрычніка 2021 года.

***— Вы неяк распавялі, што ў тым ліку для рэалізацыі канцэпцыі спектаклі тэатра прыстасоўваюцца пад такі фармат, каб іх можна было паказваць у рэгіёнах. Якія менавіта спектаклі абраны, дзе іх пакажаце?***

— Цяпер мы сур'ёзна гэтым займаемся, і ўжо два спектаклі правезлі па нашай краіне. Гэта балет «Ілюзіі кахання», ён быў паказаны ў Гомелі, і аперэта Іагана Штрауса «Лятучая мыш» — у Віцебску. І заяўкі на паказ працягваюць паступаць. Фармат спектакляў мяняецца, таму што сцэны, роўнай той, што ў нас у Вялікім, у краіне няма, і мы прыстасоўваем дэкарацыі, саставы. Але вельмі важна, каб у нашай краіне пра Вялікі тэатр ведала як мага больш грамадзян, каб яны мелі магчымасць далучыцца да яго мастацтва, не прыязджаючы ў сталіцу. Гэтае пачынанне выдатнае і вітаецца выканаўцамі.

***— Як прадстаўлены ў рэпертуары тэатра беларускі матэрыял? Чым варта кіравацца, адбіраючы літаратурныя творы для ўвасаблення ў лібрэта? Якім павінен быць літаратурны твор, каб яго хацелася ўбачыць на сцэне Вялікага тэатра?***

— Выдатнае пытанне... Таму што мы сутыкнуліся з гэтай тэмай і зразумелі, што яна вельмі шматгранная. Зразумела, што сюжэт для тэатра павінен быць змястоўным, абавязкова мець нейкую інтрыгу, моцныя сюжэтныя лініі. Безумоўна, і опера, і балет маюць свае жанравыя нюансы і схільнасць да адлюстравання тых ці іншых падзей. Умоўна кажучы, у балеце больш прывабны казачны сюжэт, а ў оперы — вялікая драма. Праўда, у супярэчнасць з тым, што я сказала, можна згадаць «Страсці» Андрэя Мдзівані і «Анастасію» Кузняцова — гэта якраз балетныя пастаноўкі. Сёння ёсць яшчэ вельмі важны трэці складнік, які дыктуе эпоха, тое, што хацела б бачыць сённяшняе грамадства. Руская опера стварыла і захавала цэлы шэраг герояў і падзей рускай гісторыі — «Барыс Гадуноў», «Хаваншчына», «Князь Ігар», «Іван Сусанін», распавяла аб гістарычных персанажах, якія адыгралі вырашальную ролю ў гісторыі краіны. А ў нас такога не хапае. Хочацца большага паглыблення ў духоўныя пачаткі, гутаркі аб тым, што нас сёння аб'ядноўвае. Мне здаецца, ёсць асобы, з'явы і нават гарады, якія ўвасабляюць нацыянальную ідэю. Безумоўна, Полацкая зямля, Полацк могуць быць аб'ектам вялікай драматычнай размовы для опернага спектакля. Як фарміравалася дзяржаўнасць, што за асобы там былі, якія адбываліся знакавыя падзеі, якія віравалі чалавечыя страсці. Хацелася б, каб з'явіўся такі оперны сюжэт, які змяшчае ключавыя моманты, што маюць дачыненне да сучаснасці. Можа быць, падыход, як у Рымскага-Корсакава, які напісаў оперу-кантату «Паданне аб нябачным горадзе Кіцежы і дзеве Фяўроніі», дзе сюжэт з'яўляецца адначасова і легендай, і гісторыяй пра тое, як узнікала дзяржава. У нашым кантэксце гэта могуць быць якія-небудзь «Полацкія пісьмёны», падзеі летапісу Полацка. Ніхто не выключаў і нейкія яркія лірычныя сюжэты, думаю, у беларускай літаратуры можна знайсці такія, у таго ж Уладзіміра Караткевіча ці на ваенную тэматыку ў Васіля Быкава. Калі казаць пра балет, то балет сёння дапускае таксама любы фармат. Прапаноўвалі нам сюжэты пра нейкія дзіўныя чароўныя падзеі, пра Усяслава Чарадзея... Можа быць, і гэта нас калі-небудзь зацікавіць. Але не паступае прапаноў, каб адбыўся вялікі праект, значны для гісторыі тэатра. А ўспомніце, колькі такіх пастановак з'явілася ў першыя гады дзейнасці тэатра і пазней, прысвечаных менавіта Беларусі! Напрыклад, у балеце «Салавей» на музыку Крошнера паводле аповесці Змітрака Бядулі прагучала тэма яднання народа, актуальная і цяпер. Сёння чаргі з лібрэтыстаў проста няма. Не ведаю, чым гэта растлумачыць. Я прашу аўтараў пісаць пра глабальныя рэчы, а атрымліваем нейкае фэнтэзі, пацешныя і нават недарэчныя сюжэты, якія не могуць быць змястоўна моцна ўвасоблены на сцэне Вялікага тэатра Беларусі.

***— Магчыма, дапаможа нейкі конкурс?***

— Так, мы ўжо звярнуліся ў Міністэрства культуры з просьбай аб'явіць конкурс на падрыхтоўку лібрэта на нацыянальна-патрыятычную тэматыку для Вялікага тэатра Беларусі. Такія конкурсы некалі практыкаваліся, можа, гэта і стымулявала тое, што сюжэты з'яўляліся. З Саюзам пісьменнікаў Беларусі мы таксама размаўлялі, чакаем сур'ёзных прапаноў. Хаця нечаканыя прапановы ёсць. Напрыклад, у наступным годзе — 85 гадоў Уладзіміру Мулявіну, разглядаем заяўку на падрыхтоўку балета аб ім. Алена Атрашкевіч гатова папрацаваць з музычным матэрыялам. Будзем думаць...

***— Нядаўна ў вас у тэатры адбыліся гастролі Санкт-Пецярбургскага Дзяржаўнага Акадэмічнага тэатра балета Барыса Эйфмана. Як ацэньваеце гэтую падзею і якія яшчэ цікавыя гастролі чакаюцца?***

— Тэатр Барыса Эйфмана прыязджае ў Беларусь ужо шосты раз. Для нас гэтая велізарная падзея, Барыс Якаўлевіч Эйфман — выдатная асоба, неверагодна таленавіты харэограф, мысляр, які праз танец перадае рэальныя падзеі і пачуцці. Тое, што робяць танцоўшчыкі Эйфмана, узрушае да глыбіні душы. І мы не можам не быць удзячныя за тое, што такой велічыні майстры прыязджаюць да нас. Хачу адзначыць, што ў тэатры Барыса Эйфмана працуюць і выхадцы з Беларусі. Два творы, якія паказалі госці ў сакавіку, — класічны ўзор балетаў на музыку, сабраную з выдатных твораў Чайкоўскага і Рахманінава з прыцягненнем сучаснай рок-музыкі. Гэта сцірае грані: здавалася б, недатыкальная класіка, як можна наважыцца да яе нешта далучыць... Але ж атрымалася! Сэнсы пераплятаюцца, пачуцці, эмоцыі... Глядзіцца на адным дыханні. Гэта і магутны менеджарскі ход, таму што прыцягваецца самая розная аўдыторыя. Барыс Якаўлевіч летась прапанаваў мне прыехаць і паглядзець яго Акадэмію танца. І ў наш праект «Балетнае лета ў Вялікім» сёлета Барыс Эйфман якраз дасылае вучняў сваёй акадэміі, моладзь, для якіх выступленне ў спектаклях «Мусагет» і «Мой Іерусалім», пастаўленых самім Барысам Якаўлевічам, будзе дзяржаўным іспытам. Для нас вялікая радасць, што гэтыя спектаклі адкрыюць наша «Балетнае лета ў Вялікім». Наогул, ідэя цудоўная, калі балетмайстар выбудоўвае пад сваё мастацтва адукацыйную вертыкаль, бачыць змену, перспектыву. А калі ў Барыса Эйфмана з'явіцца свой будынак тэатра, то, паводле нашай дамоўленасці, і мы выступім на яго сцэне.

У «Балетным леце» выступяць салісты некалькіх расійскіх тэатраў, Берлінскай оперы з асобнымі нумарамі. Таму трэба сачыць за нашай афішай — і на фестываль наш абавязкова прыйсці. Там з'явіцца і балетная трупа тэатра імя Леаніда Якабсона з Санкт-Пецярбурга, якая рэдка ў нас бывае.

«Гастрольнае лета» — наш ліпеньскі праект. Калі артысты сыходзяць у адпачынак, мы сваю сцэну аддаём гастралявальным тэатрам. Пакуль яшчэ ўдакладняюцца ўдзельнікі, не буду іх анансаваць.

Днямі танцоўшчык з сусветным іменем, выпускнік нашага харэаграфічнага вучылішча Іван Васільеў выступіў на нашай сцэне ў гонар свайго настаўніка Аляксандра Іванавіча Калядзенкі, які адзначыў 90-гадовы юбілей. Сярод яго вучняў і наш галоўны балетмайстар, заслужаны артыст Расійскай Федэрацыі Ігар Колб. Сімвалічна, што Іван Васільеў станцуе ў балеце «Жызэль», які курыруе Ігар Колб.

***— А самі плануеце куды-небудзь адправіцца на гастролі?***

— Толькі што вярнуліся з Самары, з фестывалю «Славянскі дом», і запрошаны туды ж на фестываль, прысвечаны Шастаковічу. Таму з 7 да 12 верасня трупа балета вязе туды спектакль «Ілюзіі кахання» на музыку Шастаковіча і балет «Спартак» Арама Хачатурана, аднадумца Шастаковіча. А далей трупа балета зробіць вялікі тур па гарадах Расіі, гэта ўжо ў кастрычніку. Павінна сказаць, што беларускіх артыстаў у Расіі прымаюць самым добрым, самым захопленым чынам, шануюць нашу школу. У снежні разлічваем на кітайскія гастролі, паедзе і аркестр, і салісты оперы. Так што шмат планаў.

***— На сцэне сучаснага тэатра абавязкова спалучаюцца эксперымент і традыцыя. Ці на любы эксперымент пагадзіліся б, ці любая традыцыя заслугоўвае непарушнага аўтэнтычнага захавання? У свеце ж вядомая тэндэнцыя, калі класічны твор змяняецца да непазнавальнасці — не толькі форма, але і сам меседж твора, яго пасыл гледачу...***

— Тэатр — гэта не музей. І ён не можа існаваць за шклом і пакрывацца пылам. Вядома, у рэпертуары ўсіх тэатраў свету ёсць пастаноўкі, якія ведаюць усе танцоўшчыкі, — як «Лебядзінага возера» ці «Жызэлі». Прыязджаючы ў іншы тэатр, танцоўшчык досыць лёгка ўпісваецца ў гэты спектакль, таму што ён яго ведае па пастаноўцы альбо Петыпа, альбо Горскага, альбо Льва Іванава... Але кожны балетмайстар, які працуе з такімі класічнымі творамі, укладвае нешта сваё. Абсалютна закансерваваць пастаноўку немагчыма. Нават спектаклі, пастаўленыя дваццаць-трыццаць гадоў таму, патрабуюць абнаўлення. Змяняецца майстэрства артыстаў, мастакоў і дэкаратараў... Шлях абнаўлення нічому не супярэчыць. Але я супраць такіх эксперыментаў, як, дапусцім, «мужчынскае» «Лебядзінае возера»... Павінна быць павага да партытуры, да таго, што стваралі вялікія майстры. Так, тэатр — жывая з'ява, у яго трэба ўносіць нешта новае, практыкаваць пераасэнсаванне традыцыйных падыходаў. Але галоўнае, што не павінна сыходзіць — разуменне паўнавартаснага твора мастацтва.

***— Адзін са спектакляў тэатра Барыса Эйфмана, паказаны падчас гастроляў, паводле чэхаўскай «Чайкі», пераносіць у атмасферу закулісся, што дадало цікавасці. Наколькі моцна адрозніваецца «фасад» тэатральнага жыцця, які бачаць гледачы, і тое, што адбываецца за кулісамі?***

— Калі маецца на ўвазе рэальнае закулісе — у спектаклі шмат праўдзівага. Тэатр па-свойму жорсткі. Прыходзячы туды ў юным узросце, танцоўшчыкі, спевакі паступова сталеюць і з цяжкасцю ўспрымаюць сталенне. Гэта вельмі цяжкі працэс. Усё, што адлюстравана ў балеце Эйфмана «Чайка», усе гэтыя страсці вакол прымадонны і зусім юнага стварэння, вакол тых, хто кахае, хто ненавідзіць, хто незадаволены — гэта ўсё ёсць у тэатры, як, уласна, і ў самім жыцці.

***— Калі я працавала ў фондзе Ларысы Александроўскай, былога галоўнага рэжысёра Опернага тэатра, бачыла шмат папер, звязаных з тым, як яна ўладкоўвала жыццё сваіх артыстаў, разбіралася ў іх сварках, скаргах... Колькі сіл гэта адбірае ў вас, наколькі гэта лёгка?***

— Так, ходзяць размовы пра тое, што такое тэатр... Маўляў, там абавязкова будуць інтрыгі, шкло ў пуантах, ледзяная вада ў шклянцы для вакаліста... Я глыбока перакананая: усё залежыць ад людзей. Важная атмасфера, у якую яны трапляюць, і які іх кіраўнік. Калі ён не ўдзельнічае ў сварках, не дапускае інтрыг, усяляк дае зразумець, што трэба займацца сваёй справай, расці прафесійна і не локцямі прабіваць сабе дарогу, а творчасцю, — сітуацыя будзе іншай. Не магу сказаць, што мяне закідваюць кляўзамі артысты, скардзячыся адно на аднаго. Але ёсць нешта непазбежнае — тэма ўзросту. Сыходу з прафесіі. Яна складаная для тэатра.

***— Ларыса Александроўская пакінула кранальныя ўспаміны пра тое, як у толькі што вызваленым ад нямецка-фашысцкіх акупантаў Мінску паказалі оперу «Алеся», прысвечаную барацьбе беларускага народа супраць захопнікаў. Сёлета мы адзначаем 80-годдзе вызвалення Беларусі. Як гэта зробіць тэатр?***

— Мы максімальна задзейнічаны і самі ініцыіравалі цэлы шэраг найцікавейшых праектаў. У тэатры пройдзе тэматычная выстава. Выйшла кніга, прысвечаная будынку Вялікага тэатра, вядомага аўтара — гісторыка, калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава — «Вялікі тэатр Беларусі. Падарожжа ў часе». Гэтая тэма падштурхнула нас на грандыёзнае музычнае палатно — оперу-балет, прысвечаную падзеям даваенным, ваенным, часоў акупацыі і вызвалення Беларусі і ўрачыстасці Перамогі. Спектакль будзе называцца «Патэтычны дзённік памяці». Партытура падрыхтавана, яе робіць Алег Хадоска, наш цудоўны кампазітар, загадчык кафедры кампазіцыі Акадэміі музыкі. Ствараем мы гэта на аснове выдатных твораў беларускіх кампазітараў, напісаных для Вялікага тэатра, а таксама песень і араторыяльных твораў майстроў, такіх як Лучанок, Вагнер, Смольскі... У спектаклі будзе задзейнічана практычна ўся трупа тэатра — опера, хор, балет, міманс, дзіцячая студыя. Аднавім карціну тых пакут, што выпалі на долю беларускага народа, і яго подзвігу. Прэм'еру гэтую выпускаем 22—23 чэрвеня, да пачатку аперацыі «Баграціён».

І, вядома, удзельнічаем у мерапрыемствах, якія рыхтуюцца Міністэрствам культуры да 80-годдзя вызвалення, — у буйных канцэртах, пастаноўках. Плануем у тэатры вялікі канцэрт да 3 ліпеня, гэта дзень, калі тэатр наведвае кіраўнік дзяржавы, уручае ўзнагароды найлепшым дзеячам культуры і мастацтва.

***— Сёння паўсюль шукаюць новы фармат работы з наведвальнікамі культурных установ. У вас таксама ёсць незвычайныя мерапрыемствы: экскурсіі, дні адчыненых дзвярэй, магчымасць фотасесій, конкурсы для гледачоў... Што прыжылося, што будзеце яшчэ прыдумваць?***

— Вось цяпер прыдумалі праект «Дзівосны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі». Гэта экскурсіі, калі гледачы могуць пабываць за кулісамі, пагутарыць з артыстамі і музыкантамі, убачыць тое, што ніколі вока гледача не бачыць. Мы ўнеслі гэтыя экскурсіі ў нашу афішу, і, не паверыце, на сёння білеты на ўвесь красавік і май прададзены. Сталі асвойваць фае партэра і бельэтаж — тут выстройваюцца найцікавейшыя тэматычныя кампазіцыі. Там паказваюцца нашы калекцыі касцюмаў, галаўных убораў, цяпер ідзе выстава ўзнагарод і разнастайных падарункаў Вялікаму тэатру з канца 1940-х. Ужо дадзены старт праекту «Іграюць дзеці» — перад ранішнімі спектаклямі ў фае тэатра выступаюць юныя таленавітыя музыканты, навучэнцы дзіцячых музычных школ. Імкнёмся падтрымліваць усё, што датычыцца традыцыйных каштоўнасцяў, замацаваных у нашай Канстытуцыі: сямейныя паходы ў тэатр, балеты і оперы для сямейнага прагляду. Паміж Днём маці і Днём бацькі, якія адзначаюцца ў нашай краіне, ладзім спецыяльныя сямейныя святы, у якіх удзельнічаюць сем'і нашых артыстаў. Дні адчыненых дзвярэй, ідэя шырокіх майстар-класаў карыстаецца вялікай папулярнасцю. Тэатр становіцца сапраўднай адкрытай нацыянальнай культурнай прасторай.

***— На сцэне Вялікага тэатра павінны працаваць найлепшыя з найлепшых... Як адбываецца прыток новых кадраў? Шукаеце, запрашаеце, сочыце за выпускнікамі музычных устаноў, у тым ліку Акадэміі музыкі, якую яшчэ нядаўна ўзначальвалі?***

— Ёсць важны пункт у дагаворы для маладога спецыяліста, які прыходзіць у наш тэатр, — яго ўваходжанне ў склад трупы адбываецца на конкурснай аснове. Гэта для творчых работнікаў... Але мы з вялізным задавальненнем прымаем моладзь у мастацкія майстэрні, аддзелы інфармацыйных тэхналогій, у службы арганізацыйна-кіраўнічыя. Нам усюды патрэбны людзі, якія любяць тэатр, і ўжо з цэлым шэрагам ВНУ мы заключылі дагаворы на падрыхтоўку маладых спецыялістаў. Што да творчых людзей, праводзяцца прагляды, праслухоўванні выпускнікоў харэаграфічнага каледжа, Акадэміі музыкі. У аркестр трапляюць студэнты па рэкамендацыі музыкантаў, бо за час вучобы ў іх ёсць магчымасць іграць у аркестрах. Што да оперы, атрымаць найлепшыя галасы вельмі няпроста, і гэтая праблема актуальная для ўсіх тэатраў свету. Адсюль і традыцыя запрашэння артыстаў з іншых тэатраў. Канешне, я вельмі зацікаўлена, каб у нашым тэатры выраслі такія зоркі. За апошнія тры гады ў трупу оперы прыйшла значная колькасць моладзі, ёсць і рэдкія галасы, такія як мецца-сапрана Даша Гараджанка, выдатнае сапрана Насця Міхнавец, бас Віталь Зазулька, драматычны тэнар Дзмітрый Шабеця, які з маладога спецыяліста выйшаў на сольныя пазіцыі. Конкурс у нас адкрыты, у многія спектаклі прайшлі спецыялісты з Расіі. Так, барытон Аляксей Макшанцаў прайшоў у спектакль «Севільскі цырульнік», а ў выніку апынуўся ў трупе Вялікага тэатра.

У балеце гэтая тэндэнцыя яшчэ шырэйшая, таму што ў танцоўшчыкаў досыць кароткі век, і, вядома, яны выкарыстоўваюць усе магчымасці дзесьці папрацаваць. І наш галоўны балетмайстар прыкладае шмат намаганняў у пошуках талентаў. Тут немалаважныя і тыя кантакты, што ёсць у Ігара Колба і з Барысам Эйфманам, і з Мікалаем Цыскарыдзэ, які прадстаўляе Акадэмію рускага балета імя А. Я. Ваганавай. Я з'ездзіла туды, правяла перагаворы, і Мікалай Максімавіч запрасіў мяне, нашага мастацкага кіраўніка і галоўнага балетмайстра на выпускныя іспыты Акадэміі Ваганавай, каб мы паглядзелі на моладзь, вырашылі, хто б мог да нас прыехаць. Сёння ў нас паўтара дзясятка артыстаў — выпускнікі расійскіх навучальных устаноў. Плюс з'явілася пара танцоўшчыкаў з Бразіліі. Пакуль яны прыглядаюцца, вучацца, але, спадзяюся, будуць выходзіць у сур'ёзных ролях.

***— А на сябе ў вас хапае часу?***

— Пакінем гэта за кулісамі... Калі тут выявіць хоць бы секунду нейкай абыякавасці — да людзей, падзей, фукцыянаваць гэта не будзе, бо ў тэатры ўзаемадзейнічае ўсё: ад машыністаў сцэны да тых, хто выходзіць на сцэну — гэта ўсё адзінае цэлае. Так, імкнуся падтрымліваць сябе ў добрай фізічнай форме, адпачываць, бываю на спектаклях — яны мне прыносяць велізарнае задавальненне, гэта мая вялікая прывілея як генеральнага дырэктара.

***— Толькі ў сваім тэатры бываеце на спектаклях?***

— На прэм'еры імкнуся трапляць усюды. І на філарманічныя канцэрты, і ў Палац Рэспублікі... І на кніжкі часу хапае... Прычым ізноў вярнулася да папяровага фармату — электронны перастаў мяне задавальняць, пачала раздражняць колькасць гаджэтаў, тым больш дома ў мяне цудоўная бібліятэка. Плюс вельмі люблю аўдыякніжкі: калі хаджу пешшу, вельмі шмат слухаю літаратуры.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Вернісаж

# ТВОРЫ-СНЫ АБ БЕЛАРУСІ

## Юбілей як падстава далучэння да творчасці Васіля Шаранговіча

**Калі пачаць шукаць адказ на пытанне: «Як становяцца народнымі мастакамі Беларусі?», то найлепшым адказам на яго будзе зварот да постаці Васіля Шаранговіча. Таму што ён выявіўся як таленавіты і плённы мастак-графік, як настаўнік і кіраўнік: шмат гадоў узначальваў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, пасля — Музей сучаснага выяўленчага мастацтва (стаяў ля вытокаў яго стварэння), шмат працаваў з моладдзю ў Беларускім саюзе мастакоў, сам выкладаў на кафедры графікі — паўплываў на фарміраванне айчыннай графічнай школы... Сёлета 85 гадоў з Дня нараджэння Васіля Пятровіча Шаранговіча, і яго згадваюць з удзячнасцю і вучні, і аматары мастацтва. Ды і тыя, хто любіць чытаць: як мастак ён ствараў ілюстрацыі да кніг пісьменнікаў, якіх мы называем класікамі беларускай літаратуры.**

Здаецца — уся біяграфія як на далоні. Але часам нейкая, здавалася б, нязначная рэч, можа змяніць адчуванне чалавека. Напрыклад, дакумент «Асабістая справа Васіля Пятровіча Шаранговіча», які быў пачаты ў 1955 годзе ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя Глебава. Тонкая папка, без нейкіх асаблівых дакументаў за перыяд навучання, што сведчыць: усё было выдатна, без нейкіх нечаканасцяў ці эксцэсаў.

— Мне здаецца, што ён па жыцці быў выдатнік. Пра гэта сведчыць і адзін з дакументаў — школьнае пасведчанне, дзе ўсе адзнакі — «пяцёркі». Уступныя экзамены ў вучылішча — усё «выдатна». На мой погляд, гэта выхаваныя бацькамі адказныя адносіны да ўсіх спраў, якія б ён ні рабіў. Што дало яму магчымасць стаць не толькі народным мастаком, але і цудоўным арганізатарам. Для мяне гэта паказчык таго, як можна сумяшчаць абсалютна розныя рэчы: творчы парыў, працу ў майстэрні і даволі жорсткую рэгламентаваную адміністратыўную работу. Толькі гэта дазваляе стварыць у навучальнай установе ўмовы, у якіх будуць вырастаць значныя творчыя асобы, — тлумачыць Аляксандр Шантаровіч, дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа імя А. Глебава, які скончыў Васіль Пятровіч. — Яго заўсёды цікавіла, што ў нас адбываецца. Ён быў чалавек надзвычай кантактны і добразычлівы. Васіль Шаранговіч — у першай лінейцы асоб, якімі мы ганарымся. А таксама радуемся, што маем працяг творчай дынастыі.

Яго ўнучка абрала творчасць і выкладанне сваёй прафесіяй. Пры тым, што ў яе дзядулі першапачаткова змагаліся дзве іпастасі — матэматыка і мастака — яшчэ са школы, потым ваганні працягваліся ў вучылішчы. То ён захапіўся шахматамі — а гэта матэматычнае майстэрства. Перад ім нават паўстаў выбар: ці сысці ў шахматы, ці застацца мастаком? А калі выбар быў зроблены, то парваў з шахматамі. Напэўна, каб не расцярушваць сілы. Але яго матэматычная сутнасць рэалізавалася ў сыне, які стаў праграмістам.

Цікава, што і ў іншых (асабліва ў вучнях) Васіль Шаранговіч цаніў неардынарнасць і разумеў, што шлях у мастацтва можа быць няпростым. Так здарылася, напрыклад, у Валерыя Славука, які з'яўляецца прафесарам кафедры жывапісу і графікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў:

— Калі я паступаў, быў конкурс 8—12 чалавек на месца. А я прыйшоў без спецыяльнай адукацыі. Пасля трох гадоў арміі. Пасля работы на Жодзінскім аўтазаводзе ў цэху зборкі пярэдніх і задніх мастоў... Васіль Пятровіч прымаў экзамены пры паступленні, але ў адборачнай камісіі быў яшчэ прафесар Любамудраў. Паглядзеў



Фота БелТА.

«калякі-малякі», што я прывёз з сабой. Сказаў, што гэта цікава, але ж трэба яшчэ здаць экзамены, маўляў, можаш рызыкнуць... Тады экзамены праходзілі па-іншаму. Васіль Пятровіч не хацеў браць ката ў меху і доўга размаўляў з чалавекам. Я сканцэнтраваўся на экзаменах. Але пасля дайшло да кампазіцыі, дзе трэба было паказаць чалавека ў працы — а ў мяне быў такі досвед і армейскі, і працоўны, і ў сельскагаспадарчым тэхнікуме ў свой час вучыўся, ведаю, што такое работа ў калгасе, дзе я амаль год працаваў. Пачаў рабіць. Васіль Пятровіч падышоў, калі я працаваў над пятай ці шостай кампазіцыяй. Паляпаў мяне па плячы: «Ты ж глядзі, нікуды не з'язджай»... Мяне прынялі з умовай, што калі не замацуюся ў першым семестры, то каб ніякіх крыўдаў. І я ўцягнуўся. Атрымалася. І цяпер маю практычна ўсе званні, якія толькі могуць быць у Беларусі.

Згодна з успамінамі вучня, Васіль Пятровіч не быў «добранькім» прафесарам, а быў даволі строгім і патрабавальным выкладчыкам. Калі чалавек ленаваўся, то Васіль Пятровіч вызначаў, ці патрэбны ён наогул кафедры.

З моладдзю працаваў і калі стаў сакратаром у Беларускім саюзе мастакоў, падкрэсліла дачка Васіля Шаранговіча Наталля, якая з'яўляецца вядомым мастацтвазнаўцам: «Тое пакаленне — Шчамялёў, Вашчанка, іншыя асобы — людзі, якія фарміравалі беларускую мастацкую школу на мяжы 70-80-х гадоў. Але яны ніколі не пазбягалі грамадскай работы. Яны лічылі, што Саюз мастакоў — гэта арганізацыя, у якой могуць расці творчыя сілы. Ён пайшоў працаваць у Саюз, нягледзячы на тое, што ўжо працаваў як загадчык кафедры графікі, і сам пры гэтым хацеў рэалізоўвацца як мастак. Ён стаў сакратаром па моладзі. Маладзёжныя выстаўкі тады былі вельмі папулярныя. Моладзь неабходна было прыцягваць. На з'ездах кіпелі жарсці, ішлі актыўныя спрэчкі — усё пра мастацтва. А калі згадаць выстаўкі тых гадоў, то яны былі прысвечаны пэўным дзеячам культуры Беларусі. Творцы адкрывалі для сябе беларускую культуру і праз розныя сродкі мастацкай мовы выяўлялі Беларусь».

Васіль Пятровіч скончыў вучылішча як жывапісец, а ў тэатральна-мастацкім інстытуце вучыўся і далей рэалізоўваўся як графік. У Беларусі тады толькі пачала закладвацца на ўзроўні ВНУ кафедра графікі (на той час у СССР графікаў рыхтавалі наогул у выбраных ВНУ). А тут падарунак — адкрылася спецыяльнасць у Мінску. Мажліва, Васілю Пятровічу спадабалася магчымасць хуткага выказвання, тыражавання кніжнай ілюстрацыі, а калі стаў вучыцца, то яму вельмі спадабалася. Ён быў мастак, які валодаў усімі тэхнікамі графікі. Сам навучыўся і навучаў сваіх вучняў, што ў беларускай школе графікі было важна. Малюнак лічыў асновай любой школы. Па гэтым ацэньваў прафесіяналізм: умее чалавек маляваць ці не. Людзі, якія добра ведалі Васіля Шаранговіча, адзначаюць яго перфекцыянізм, які быў і рысай характару, і выяўляўся ў творчасці. Нездарма большасць яго знакавых работ знаходзіцца ў музеях.

Васіліна Міцкевіч, галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, кажа, што з мастаком у іх склаліся вельмі цёплыя адносіны. Дзякуючы гэтаму ў фондах музея захоўваецца 108 мастацкіх прац Васіля Шаранговіча: 10 ілюстрацый да вершаў Якуба Коласа і серыя ілюстрацый да паэмы «Новая зямля». Гэта адна з самых запатрабаваных серый мастацкіх работ, што захоўваюцца ў музеі. «Ведаю, што Васіль Пятровіч з асаблівай любоўю ставіўся да творчасці Якуба Коласа. Вельмі тонка адчуваў хараство слова народнага Песняра, і тое, пра што пісаў Колас, было блізкае яго сэрцу. Напэўна, таму ў мастака атрымалася маляўніча, яскрава і рэалістычна перадаць тое, пра што казаў Якуб Колас. Нездарма ў кнізе «Новая зямля», якая была выдадзена на трох мовах (беларускай, польскай і англійскай), былі выкарыстаныя яго ілюстрацыі. І ў 2014 годзе была выдадзена «Новая зямля» на беларускай мове — таксама з ілюстрацыямі Шаранговіча. Гэтыя кнігі сталі падарункамі ганаровым гасцям, і цяпер іх знайсці немагчыма».

Цяжка ўявіць год, калі б мастацкія працы Васіля Пятровіча не выстаўляліся ў музеі Якуба Коласа. Яго ілюстрацыі да «Новай зямлі» ўдзельнічаюць у розных выставачных праектах музея не толькі ў Беларусі, але і за межамі. І, магчыма, здарыцца момант, калі серыя ілюстрацый да «Новай зямлі», якая складаецца з 95 работ, будзе выстаўленая цалкам...

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, які сёлета адзначае 80-годдзе стварэння, таксама можа пахваліцца неблагой калекцыяй твораў Васіля Шаранговіча. Словы Купалы ён чуў з дзяцінства: маці ведала на памяць шмат вершаў і чытала іх сваім дзецям. Дыпломная работа Васіля Пятровіча ў тэатральна-мастацкім інстытуце была прысвечана творчасці Купалы. Ён стварыў ілюстрацыі значных паэм Песняра. 17 ілюстрацый з гэтай серыі папоўнілі фонды музея ў 2021-м — гэта быў падарунак аўтара. «Мастацкая «Купаліяна» нашага музея самая багатая ў свеце: у фондах музея больш за 2000 работ, прысвечаных Янку Купалу, з іх 137 — творы Васіля Пятровіча Шаранговіча, — гаворыць галоўны захавальнік Купалаўскага музея Надзея Саевіч. — Ён змог улавіць сутнасць творчасці Купалы. А ў цэнтры ілюстрацыі «А хто там ідзе?» сярод постацяў простых беларусаў, якія гатовыя змагацца за шчасце Айчыны, выяўлены бацька Васіля Пятровіча. Работы з нашага збору ўдзельнічаюць у розных праектах, якія ладзяцца з нагоды юбілею мастака. Адзін з іх — «Сны аб Беларусі» — адбудзецца на пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі краіны».

Шмат выставак сёлета прапануюць нам ацаніць творчую асобу Васіля Шаранговіча з розных бакоў. З 18 красавіка вялікая вялікую экспазіцыю прадстаўляе Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. Выстаўлены класічныя работы мастака: серыя, прысвечаная паэме Маякоўскага «Уладзімір Ільіч Ленін», вялікая серыя «Памяці вогненных вёсак» і такія вядомыя творы, як партрэты Францыска Скарыны, Максіма Танка. Таксама малюнкі і акварэлі, што прысвечаны яго роднай Мядзельшчыне, Нарачанскаму краю (некаторыя з калекцыі сям'і мастака). Другая частка экспазіцыі прысвечана вучням Васіля Пятровіча: каля 70 графічных работ вядомых выпускнікоў акадэміі мастацтва, сярод якіх Мікалай Селяшчук, Валерый Славук, Віктар Александровіч... Калі склалі спіс усіх вучняў, то атрымалася чатыры старонкі імён тых, хто вучыўся ў розныя гады. Немагчыма было паказаць усіх, таму ёсць толькі выбраныя работы асобных аўтараў: каб паказаць, што ў добрага настаўніка ўсе вучні розныя. Яны могуць працаваць не толькі ў розных тэхніках, а нават у розных кірунках мастацтва, яны ўздымаюць розныя тэмы. Варта паглядзець, каб упэўніцца: у Беларусі была, ёсць і будзе цудоўная школа графікі. Куратар выстаўкі «Васіль Шаранговіч. Асоба. Мастак. Настаўнік» Аляксей Мацюшонак запэўнівае, што выстаўка прадстаўляе ўсе магчымыя тэхнікі, у якіх працавала кафедра графікі: лінагравюра, літаграфія, ксілаграфія, афорт, змешаныя тэхнікі, акварэль.

...Вялікі цыкл, створаны паводле Адама Міцкевіча, мастак таксама пакінуў у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Дачка згадвае: праілюстраваўшы паэму Міцкевіча, якая была выдадзена, Васіль Пятровіч атрымаў прапанову ад варшаўскага нацыянальнага музея прадаць гэтыя творы ў Польшчу, але яго рашэнне было імгненным і адназначным: «Усё мае мастацтва павінна застацца ў Беларусі!»

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

PARITETBANK

## ОАО «ПАРИТЕТБАНК»
## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 31 ДЕКАБРЯ 2023 ГОДА

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Примечания | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **АКТИВЫ:** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 6.1 | 74 393 | 51 776 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6.2 | 64 699 | 151 961 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6.3 | 110 079 | 56 124 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 6.4 | 97 893 | 115 086 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 6.5 | 449 855 | 368 313 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 6.6 | - | 235 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 6.7 | 10 | 8 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 6.8 | 55 829 | 51 532 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 6.9 | 1 240 | 178 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 6.10 | 531 | 492 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 6.11 | 10 176 | 7 139 |
| 15 | ИТОГО АКТИВЫ | 11 | | 864 705 | 802 844 |
| **16** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА:** | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 6.12 | 68 044 | 56 426 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 6.13 | 578 926 | 550 946 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 6.14 | 67 195 | 69 319 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 6.15 | 14 509 | 3 759 |
| 24 | ИТОГО обязательства | 120 | - | 728 674 | 680 450 |
| **25** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ:** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 6.16 | 66 055 | 66 055 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 6.17 | 8 540 | 7 967 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 6.18 | 16 944 | 13 217 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 6.19 | 44 492 | 35 155 |
| 31 | ИТОГО собственный капитал | 121 | | 136 031 | 122 394 |
| 32 | ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ | 12 | | 864 705 | 802 844 |

## ОАО «ПАРИТЕТБАНК»
## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2023 ГОД

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Примечания | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 67 401 | 77 081 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 34 075 | 45 260 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7.1 | 33 326 | 31 821 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 40 124 | 31 856 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 11 500 | 8 729 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7.2 | 28 624 | 23 127 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7.3 | 1 505 | (512) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7.4 | 20 078 | 15 181 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 7.5 | 441 | 123 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 7.6 | 12 154 | 18 636 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7.7 | 6 742 | 5 693 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 7.8 | 63 384 | 48 502 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 7.9 | 1 737 | 1 641 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 13 441 | 6 654 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 7.10 | 3 774 | 247 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 9 667 | 6 407 |
| 18 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях: | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 7.11 | 0,0000 | 0,0000 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

## ОАО «ПАРИТЕТБАНК»
## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2023 ГОД

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Уставный фонд | Резервный фонд | Накопленная прибыль | Фонды переоценки статей баланса | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1** | **Остаток на 31 декабря 2021 г.** | **3011** | **66 056** | **6 277** | **30 187** | **12 752** | **115 272** |
| 1.1 | В том числе: Изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | (1) | 1 690 | 4 968 | 465 | 7 122 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | - | - | 6 407 | 717 | 7 124 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | 1 432 | (1 432) | - | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | (1) | - | (1) | - | (2) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | - | - | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | - | - | (1) | - | (1) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | (1) | - | - | - | (1) |
| 2.7 | Внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | - | - | - | - | - |
| 2.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | 258 | (258) | - | - |
| 2.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | 252 | (252) | - |
| **3** | **Остаток на 31 декабря 2022 г.** | **3013** | **66 055** | **7 967** | **35 155** | **13 217** | **122 394** |
| 4 | Остаток на 31 декабря 2022 г. | 3011 | 66 055 | 7 967 | 35 155 | 13 217 | 122 394 |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | 573 | 9 337 | 3 727 | 13 637 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | - | - | 9 667 | 3 727 | 13 394 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | 320 | (320) | - | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками): | 30123 | - | - | (1) | - | (1) |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | - | - | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | - | - | (1) | - | (1) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | - | - | - | - |
| 5.7 | внесение акционерами денежных средств в резервный фонд, на покрытие убытков | 301234 | - | - | - | - | - |
| 5.8 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | 253 | (9) | - | 244 |
| 5.9 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | - | - |
| **6** | **Остаток на 31 декабря 2023 г.** | **3013** | **66 055** | **8 540** | **44 492** | **16 944** | **136 031** |

## ОАО «ПАРИТЕТБАНК»
## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2023 ГОД

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Примечания | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | - | 9 667 | 6 407 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | - | 3 727 | 717 |
| | В том числе: | | | | |
| 2.1 | переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | - | 2 732 | (947) |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | - | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | - | 995 | 1 664 |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | - | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | - | - | - |
| **3** | **ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД** | **30121** | **-** | **13 394** | **7 124** |

## ОАО «ПАРИТЕТБАНК»
## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2023 ГОД

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Примечания | 2023 год | 2022 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 59 669 | 74 546 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (34 254) | (45 060) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 46 394 | 31 770 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (11 824) | (8 511) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | - | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 1 187 | (270) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 19 877 | 44 289 |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 207 | 386 |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 12 021 | 10 972 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (58 955) | (46 607) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (4 478) | - |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 29 844 | 61 515 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (248) | 632 |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (58 064) | (25 140) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (4 449) | 33 975 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (53 306) | (18 229) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (14 155) | (626) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (130 222) | (9 388) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | - | (17 158) |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 6 876 | 5 088 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | (16 465) | 88 699 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (1 899) | (1 087) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 6 442 | (6 549) |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | (5 046) | 68 993 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (105 424) | 121 120 |
| **29** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (7 341) | (4 355) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 253 | 398 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | (1) | (3) |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, учитываемых по амортизированной стоимости | 71104 | | (26 762) | (47 185) |
| 35 | Погашение (реализация) приобретенных ценных бумаг, учитываемых по амортизированной стоимости | 71105 | | 41 764 | 234 |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | 7 913 | (50 911) |
| **37** | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп акций собственной эмиссии | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных акций собственной эмиссии | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (1) | (1) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | (1) | (1) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 15 466 | 19 934 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | (82 046) | 90 142 |
| **45** | **Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода** | **740** | **12** | **231 490** | **141 348** |
| **46** | **Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода** | **741** | **12** | **149 444** | **231 490** |

И. о. Председателя Правления
Д. А. Панкевич
22 марта 2024 года
Минск

Главный бухгалтер
Е. М. Скриба
22 марта 2024 года
Минск

Адрес соответствующей страницы интернет-сайта банка, где размещена отчетность о деятельности банка в полном объеме:
**https://www.paritetbank.by/**

ОАО «Паритетбанк». УНП 100233809. Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 01 апреля 2021 года № 5.

Общество с ограниченной ответственностью «Кэпт»
Бизнес-центр «Академия»
ул. Платонова, д. 49, пом. 26-7
Минск, Беларусь 220012
Телефон + 375 740 740 9090
Факс + 375 740 740 9797

kept

# АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

**Карпову Сергею Александровичу**
**Председателю Правления ОАО «Паритетбанк»**

**Заключение по результатам аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности**

**Аудиторское мнение**

Мы провели аудит годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Паритетбанк» (далее – «Банк» или «аудируемое лицо») (место нахождения: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Киселева, д. 61а, дата государственной регистрации: 15 мая 1991 года, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: 100233809), состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2023 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала и отчета о движении денежных средств за 2023 год, примечаний к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, предусмотренных законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности банками.

По нашему мнению, прилагаемая годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность отражает достоверно во всех существенных аспектах финансовое положение Банка по состоянию на 31 декабря 2023 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2023 год, в соответствии с законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности банками.

**Основание для выражения аудиторского мнения**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» (с последующими изменениями и дополнениями), Инструкции о регулировании аудиторской деятельности в банках, банковских группах и банковских холдингах, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 декабря 2019 года № 495 (с последующими изменениями и дополнениями), и национальных правил аудиторской деятельности. Наши обязанности в соответствии с этими требованиями описаны далее в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности» настоящего заключения. Нами соблюдались принцип независимости по отношению к Банку согласно требованиям законодательства и принципы профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения.

**Ключевые вопросы аудита**

Ключевые вопросы аудита – это вопросы, которые, согласно нашему профессиональному суждению, являлись наиболее значимыми для нашего аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности за текущий период. Эти вопросы были рассмотрены в контексте нашего аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в целом и при формировании нашего аудиторского мнения об этой отчетности, и мы не выражаем отдельного мнения по этим вопросам.

**Резерв на покрытие возможных убытков по кредитам корпоративным клиентам**

См. примечание 6.5 «Кредиты клиентам» и примечание 12 «Политика управления рисками» к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

| Ключевой вопрос аудита | Аудиторские процедуры в отношении ключевого вопроса аудита |
|---|---|
| В соответствии с требованиями действующего законодательства Банк формирует специальные резервы на покрытие возможных убытков по активам и обязательствам, не отраженным на балансе. | Мы провели анализ ключевых аспектов методологии и политики Банка, относящихся к формированию специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе, на предмет соответствия требованиям Инструкции о порядке формирования и использования специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 28 сентября 2006 года № 138 с последующими изменениями и дополнениями (далее – «Инструкция № 138»).<br>Мы провели тестирование дизайна и внедрения контролей, а также операционной эффективности отдельных контролей в отношении процесса формирования специальных резервов на покрытие возможных убытков по кредитам корпоративным клиентам, включая мониторинг платежной дисциплины, финансового положения и залогового обеспечения заемщиков, а также в отношении определения соответствующих групп кредитного риска. |

**Резерв на покрытие возможных убытков по кредитам корпоративным клиентам**

См. примечание 6.5 «Кредиты клиентам» и примечание 12 «Политика управления рисками» к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

| Ключевой вопрос аудита | Аудиторские процедуры в отношении ключевого вопроса аудита |
|---|---|
| Вопрос формирования специальных резервов на покрытие возможных убытков по кредитам корпоративным клиентам является ключевым вопросом аудита в связи с существенным объемом кредитов корпоративным клиентам (составляющих 30 % от величины совокупных активов), применением профессионального суждения и субъективных допущений при определении величины резервов, а также существенным влиянием потенциального изменения специальных резервов на покрытие возможных убытков на показатели деятельности Банка и годовую индивидуальную бухгалтерскую (финансовую) отчетность. | По выборке кредитов корпоративным клиентам, потенциальное изменение специальных резервов на покрытие возможных убытков по которым может оказать существенное влияние на показатели деятельности Банка и годовую индивидуальную бухгалтерскую (финансовую) отчетность, мы провели тестирование соблюдения требований Инструкции №138 и локальных правовых актов Банка в части корректной классификации кредитов по группам риска и формирования резервов на покрытие возможных убытков посредством анализа финансовой и нефинансовой информации, а также допущений и профессиональных суждений, использованных Банком.<br>Мы также провели оценку того, отражают ли раскрытия информации в примечаниях к годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности надлежащим образом подверженность Банка кредитному риску. |

**Обязанности аудируемого лица по подготовке годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Руководство несет ответственность за подготовку и достоверное представление годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством и нормативными правовыми актами Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и составления годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности банками, и организацию системы внутреннего контроля Банка, необходимой для подготовки годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности руководство несет ответственность за оценку способности Банка продолжать непрерывно свою деятельность, за раскрытие в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, и за составление отчетности на основе допущения о непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать Банк, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности**

Наша цель состоит в получении разумной уверенности в том, что годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений вследствие недобросовестных действий или ошибок, и в выпуске аудиторского заключения, содержащего наше аудиторское мнение. Разумная уверенность представляет собой высокую степень уверенности, но не является гарантией того, что аудит, проведенный в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года № 56-З «Об аудиторской деятельности» (с последующими изменениями и дополнениями), Инструкции о регулировании аудиторской деятельности в банках, банковских группах и банковских холдингах, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11 декабря 2019 года № 495 (с последующими изменениями и дополнениями), и национальных правил аудиторской деятельности, всегда выявляет существенные искажения при их наличии. Искажения могут быть результатом недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно предположить, что в отдельности или в совокупности они могут повлиять на экономические решения пользователей, принимаемые на основе этой годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

